УДК 069.124+026:069

# МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЗАНЯТКІ Ў МУЗЕІ-БІБЛІЯТЭЦЫ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА ЯК ФОРМА АКТУАЛІЗАЦЫІ КНІЖНАЙ СПАДЧЫНЫ

***Д. А. Кашкур,*** *старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік», філіял – Музей беларускага кнігадрукавання; саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле апісана экспазіцыя Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага (філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка), вылучаны найбольш каштоўныя кніжныя помнікі, якія захоўваюцца ў музеі. Дадзена характарыстыка адной з важнейшых функцый музея – актуалізацыі спадчыны, якая з'яўляецца асноўным механізмам функцыянавання апошняй. Вызначаны асноўныя формы актуалізацыі спадчыны, якія рэалізуюцца ў музеі, сярод іх вылучана музейна-педагагічная дзейнасць, асаблівасць якой заключаецца ў сувязі тэорыі з практыкай. Прааналізавана, якім чынам гэта форма рэалізуецца на базе Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага. Апісаны музейна-педагагічныя заняткі, якія праходзяць у экспазіцыі музея, сярод іх – «Запрашаем у свет кнігі» (для дашкольнікаў), «Як вучыліся дзеці раней» (для вучняў 3-га класа), «Сімяон Полацкі: муж дабраверны кніжнай справе верны» (4-га класа).

**Ключавыя словы:** актуалізацыя спадчыны, кніжная спадчына, кніжныя помнікі, музейна-педагагічныя заняткі, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# MUSEUM AND PEDAGOGICAL CLASSES AT THE MUSEUM-LIBRARY OF SIMIAON OF POLACK AS A FORM OF THE ACTUALIZATION OF BOOK HERITAGE

***D. Kashkur,*** *Senior Researcher of the Cultural Institution of Scientific Research and Education «Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve», branch – Museum of the Belarusian Book-Printing, Applicant for the Degree of Candidate of Sciences of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article describes the exposition of the Simeon Polotsky Museum-Library, (a branch of the Polotsk National Historical and Cultural

Museum-Reserve), highlights the most significant book monuments stored in the museum. The author defines the actualization of heritage as one of the most important museum tasks and the main mechanism of the heritage functioning. The main forms of actualization of heritage realized in the museum are determined, among them the museum-pedagogical activity is singled out, the peculiarity of which is the connection of theory with practice. The author analyzes the way in which this form is implemented on the basis of the Museum-Library of Simeon Polotsky. The article describes the museum-pedagogical classes held in the museum's exposition, among them – «We invite you to the world of books» (for preschoolers), «How children studied before» (for 3rd grade students), «Simeon Polotsky: a kindly man is faithful to the book heritage» (for 4th grade students).

**Keywords:** actualization of heritage, book heritage, book monuments, museum-pedagogical classes, Museum-Library of Simeon Polotsky.

Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага – адзін з філіялаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Ён быў адкрыты ў 1994 г. у адным будынку з Музеем беларускага кнігадрукавання – у сценах помніка архітэктуры канца XVIII ст., які раней належаў Полацкаму Богаяўленскаму мужчынскаму манастыру. Музей з’яўляецца комплексным і яднае ў сабе рысы гістарычнага, мемарыяльнага і літаратурнага музеяў.

Экспазіцыя аб’яднана з навуковай бібліятэкай і чытальнай залай, дзе захоўваецца фонд навуковай бібліятэкі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Інтэр’ер аформлены ў стылі заходнееўрапейскай бібліятэкі канца XVII – пачатку XVIII ст.

У экспазіцыі прадстаўлены 141 музейны прадмет, праз іх раскрываецца жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага. Найбольшай каштоўнасцю сярод экспанатаў вызначаюцца арыгіналы кніг асветніка: «Тестамент» (1680), «Вечеря душевная» (1683), «Жезл правления» (1753). Акрамя таго, у музеі прадстаўлены копіі асобных вершаў, рукапісных збораў знакамітага палачаніна і выданняў Верхняй друкарні, заснаванай Сімяонам Полацкім у Маскве, а таксама сучасныя навуковыя даследаванні спадчыны асветніка і найноўшыя перавыданні яго твораў [4].

Адной з важнейшых задач Музея-бібліятэкі з’яўляецца актуалізацыя кніжнай спадчыны Сімяона Полацкага, бо гэты працэс з’яўляецца асноўным механізмам функцыянавання спадчыны. Актуалізацыя прадстаўляе сабой дзейнасць па захаванні і ўключэнні спадчыны ў сучасную культуру шляхам актывізацыі сацыякультурнай ролі яе аб’ектаў і іх інтэрпрэтацыі [1].

Актуалізацыя ў музеі адбываецца ў працэсе музейнай вытворчасці, калі вызначаецца каштоўнасць аб’екта (падчас выяўлення прадметаў музейнага значэння, навукова-фондавай і навукова-даследчай работы), і музейнага спажывання, калі суб’ект успрымае каштоўнасць аб’екта (падчас экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці) [3, с. 17; 6, с. 7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Сярод формаў актуалізацыі спадчыны вызначаецца музейна-педагагічная дзейнасць, якая прадугледжвае сістэмнае і дакладна накіраванае ўзаемадзеянне музейнага педагога і навучэнцаў, у выніку якога апошнія атрымліваюць навыкі арыентацыі ў музейнай прасторы, вучацца расшыфроўваць «коды», якія закладзены ў экспазіцыі і музейных прадметах, атрымоўваюць вопыт судакранання з арыгіналам. Музейная педагогіка дапамагае фарміраваць у дзяцей каштоўнасныя адносіны да набыткаў культурнай спадчыны, развіваць творчыя кірункі сталеючай асобы.

Музейна-педагагічны працэс засноўваецца на адукацыйнай тэхналогіі edutainment, якая прадугледжвае навучанне праз гульню, калі веды перадаюцца ў зразумелай, простай і цікавай форме ў вольнай атмасферы на базе музея і замацоўваюцца на практыцы [2].

Супрацоўнікамі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка распрацаваны цыкл музейна-педагагічных праграм для дашкольнікаў і дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Праграмы рэалізуюцца ва ўсіх філіялах запаведніка, у т. л. у Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага. Яго залы выкарыстоўваюцца падчас правядзення музейна-педагагічных заняткаў «Запрашаем у свет кнігі» (для дашкольнікаў), «З гісторыі пісьмовых прылад» (для вучняў 1-га класа), «Як вучыліся дзеці раней» (3-га класа). Заняткі пачынаюцца ў экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання і працягваюцца ў Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага [5].

РЕПОЗИТОРИЙ




На музейна-педагагічных занятках «Запрашаем у свет кнігі» дашкольнікі ўпершыню знаёмяцца з экспазіцыямі Музея беларускага кнігадрукавання і Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага, а таксама з кніжнымі помнікамі, якія тут экспануюцца. Дзеці даследуюць элементы кнігі, даведваюцца, з якіх матэрыялаў і якім чынам кніга стваралася ў розныя часы. Да заняткаў у Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага для дзяцей загадзя рыхтуецца выстава сучасных дзіцячых выданняў, многія з іх выраблены ў форме цацак. Для лепшага засваення інфармацыя на занятках падаецца ў розных формах, у т. л. у форме гульні [5].

Падчас заняткаў «Як вучыліся дзеці раней» трэцякласнікі даследуюць асаблівасці школьнага навучання XII і XVII стст., вывучаюць кнігі, па якіх вучыліся дзеці ў старажытных школах. Пра адукацыйны працэс XII ст. размова вядзецца ў зале рукапіснай кнігі Музея беларускага кнігадрукавання, XVII ст. – у экспазіцыі Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага, на месцы якой у тым жа стагоддзі размяшчалася праваслаўная брацкая школа [5].

Заняткі «Сімяон Полацкі: муж дабраверны кніжнай справе верны» распрацаваны ў 2021 г. для вучняў 4-га класа. Яны цалкам праходзяць у экспазіцыі Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага. Аповед пра жыццё і дзейнасць асветніка суправаджаецца дэманстрацыяй яго рукапісных і друкаваных кніг з экспазіцыі музея. Для замацавання ведаў школьнікам прапануецца практычнае заданне: запісаць радкі, створаныя Сімяонам Полацкім, у форме зоркі, сэрца і крыжа [5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, сярод формаў актуалізацыі кніжнай спадчыны, якія рэалізуюцца ў Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага, вылучаюцца музейна-педагагічныя заняткі. Яны дазваляюць дзецям даследаваць кніжныя помнікі ў гульнёвай форме, што ў сукупнасці з нязмушанай музейнай атмасферай закладвае станоўчы вобраз музея ў дзіцячай свядомасці, спрыяе фарміраванню ў маленькіх наведавальнікаў каштоўнасных адносін да спадчыны і ўстойлівай патрэбы ў камунікацыі з музейным прадметам.


*1.* Актуализация наследия [Электронный ресурс] // Российская музейная энциклопедия. – Режим доступа: http://museum.ru/rme/dictionary.asp?41. – Дата доступа: 18.04.2022.

*2. Кашкур, Д. А.* Музейна-педагагічныя заняткі як форма актуалізацыі помнікаў кніжнай культуры / Д. А. Кашкур // Материалы II Междунар. науч. конф. «Новые коммуникативные технологии и современное белорусское общество», Новополоцк, 22–23 апр. 2021 г. / Полоцк. гос. ун-т; под общ. ред. С. О. Шидловского. – Новополоцк, 2022. – С. 70–74.

*3. Мастеница, Е. Н.* Актуализация культурного наследия в музее: вызовы современности / Е. Н. Мастеница // Вестн. КемГУКИ. – 2020. – № 50. – С. 14–20.

*4.* Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://simeon.polotsk.museum.by/be. – Дата доступу: 18.04.2022.

*5.* Музейныя заняткі [Электронны рэсурс] // Музей беларускага кнігадрукавання. – Рэжым доступу: http://book.polotsk.museum.by/be/node/49796. – Дата доступу: 20.04.2022.

*6. Сапанжа, О. С.* Культурологическая теория музейности : автореф. дис. ... д-ра культурологии : 24.00.01 / О. С. Сапанжа ; Росс. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – СПб., 2011. – 58 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 378:784.9

# ПЕРСПЕКТИВНЫЕ МЕТОДЫ ОЦЕНКИ ВОКАЛЬНЫХ ВОЗМОЖНОСТЕЙ

***А. В. Ковалев,*** *старший преподаватель кафедры эстрадной музыки учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** Информационные технологии неразрывно связаны с современным музыкальным искусством. Вокальное искусство адаптируется под текущие условия и использует все передовые технологии для улучшения качества звучания голоса как на концертных выступлениях, так и в